**Канспект занятку па адукацыйнай галіне “Развіццё беларускага маўлення і культура маўленчых зносін” для дзяцей першай малодшай групы**

**Тэма:** Пеўнік Кукарэку і курка Рабка

**Праграмныя задачы:** развіваць уменні ўважліва слухаць і разумець маўленне дарослага, удзельнічаць у дыялогу, фарміраваць уменне ўспрымаць і ўзнаўляць элементы простых твораў (пацешкі) на беларускай мове (гукаперайманне, асобныя словы), фарміраваць навыкі правільнага вымаўлення гукаў, выхоўваць цікавасць да беларускай мовы, жаданне размаўляць па-беларуску

**Матэрыял і абсталяванне:** пеўнік і курачка (цацкі), маленькі кошык з цацачнымі яйкамі, аўдыёзапіс песенкі “Выйшла курачка гуляць”, аўдыёзапіс голасоў пеўніка і курачкі, рознакаляровыя кавалачкі паперы (зярняткі), цацачныя талерачкі, шапачкі-кураняткі

**Ход занятку**

**Уводная частка.**

Гучыць аўдыёзапіс “ку-ка-рэ-ку”

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (далей В.):**

Хто ж гэта так гучна крычыць?

(паказвае аб’ёмную цацку пеўня)

**В.:** Вось які прыгожы пеўнік да нас завітаў.

Дзеці гладзяць пеўніка, разглядаюць яго.

**Асноўная частка.**

В.: Дзе ў пеўніка дзюба, лапкі?

Якога колеру грабенчык?

Дзе крылы? і г. д.

Як спявае пеўнік?

Дзеці хорам: ку-ка-рэ-ку, ку-ка-рэ-ку

Давайце так і назавем нашага пеўніка - Кукарэку.

А зараз паслухайце пацешку пра пеўніка

*Кукарэку, певунок,*
*залаценечкі чубок,*
*Пад паветачку пайшоў,*
*Курку- рабку там знайшоў*
*Пачаў курку пытаць,*
*Ці умее чытаць.*
*-не чытаю не пішу, толькі яйкі нясу.*
*Што дзень дзецям нашу*
*Аж па цэламу кашу.*

(прагаворвае пацешку некалькі разоў)

В.: Каго знайшоў пеўнік ? (Курачку)

Давайце і мы дапаможам нашаму пеўніку знайсці курачку

Выконваюцца ***дынамічныя рухі «Прагулка».***

Раз-два-тры, раз-два-тры, *Хадзьба адзін за адным па крузе*
Па сцяжынцы мы пайшлі, *з рытмічным падыманнем ног і рухамі*

| | |
|---|---|
| Вось так, вось так,<br>Так бадзёра мы пайшлі. | *рукамі.* |
| Тут сцяжынка вузкай стала,<br>Мы на цыпачкі ўсе сталі.<br>Вось так, вось так,<br>І, як пеўні, зашагалі. | *Хадзьба на насочках, рукі паднятыя ўгару, спіна прамая, галава прыпаднятая.* |
| На сцяжынцы лужы, лужы.<br>Мы праскочым іх усе дружна,<br>Вось так, вось так,<br>Мы праскочым іх усе дружна, | *Рукі на поясе, скачкі праз «лужы», якія ляжаць на падлозе пасярэдзіне залы.* |
| Па слядочках крок у крок,<br>Пойдзем мы ў гэты бок.<br>Вось так, вось так,<br>Па слядках — у гэты бок. | *Рукі на поясе, спіна прамая, хадзьба па «слядочках».* |
| Ну, а потым вельмі дружна<br>Зноў праскочым мы праз лужы. | *Скачкі на дзвух нагах з перамяшчэннем уперад.* |
| Хутка, спрытна,<br>Лёгка, лоўка<br>Вось так — спрытна,<br>Вось так — лоўка,<br>Будзем пеўніку дапамагаць<br>І курачку яму шукаць. | *Лёгкі бег па крузе адзін за адным.*<br>*Пераход на хаду.* |

Дзеці знаходзяць курачку (цацку).
Пеўнік “дзякуе” , што дапамаглі знайсці яго сяброўку.

Дзеці разам з дарослым разглядаюць курачку, гладзяць яе.
Слухаюць аўдыезапіс голаса куркі.
Прагаворваюць “ко-ко-ко”( некалькі разоў)
(каля курачкі дзеці знаходзяць кошык з яйкамі )

**В.** задае пытанні дзецям:
Якая курачка? (прыгожая, добрая…)
Што нясе курачка ? (яйкі)
**В.:** З яек вылупляюцца кураняткі.
Наш пеўнік Кукарэку чароўны. Ён вас можа ператварыць у маленькіх куранят і вы пагуляеце з курачкай. Хочаце?
Дык закрывайце вочкі.
Пеўнік дакранаецца да дзяцей і на галаву апранаюцца шапачкі-куранят.

**Рухомая гульня** “Выйшла курачка гуляць”

(гучыць аўдыёзапіс песенкі “Выйшла курачка гуляць” дзеці ўслед за дарослым выконваюць рухі па тэксце)

**В.:** А зараз я прапаную пачаставаць курачку і пеўніка жоўтымі зярняткамі
(на сталах разложаны зярняткі рознага колеру (кавалачкі паперы) дзеці выбіраюць на талерачкі толькі  жоўтыя)
Частуюць “зярняткамі” пеўніка і курачку.

**В.:** Дзеці, хто быў сення ў нас у гасцях? Якія яны? Як яны з намі гаварылі? Якую песню  спявалі? У якую гульню гулялі? Чым мы іх частавалі? Курачка і пеўнік спяшацца ў госці да другіх дзяцей, давайце з імі развітаемся.
Дзеці развітваюцца з гасцямі.